

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защито-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№40 (226). 4 —10 кастрычніка 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 200 руб.

Цяжкая спадчына



Фота Віталя ГІЛЯ

Ад нашай спадчыны адмовіцца ўжо нельга, бо дзесяць гадоў стаяць на яе хісткім падмурку, бо ў большай паловы з нас у крыві надзея на "добрага" пана, які абавязкова зменіць наша жыццё да лепшага.

А пакуль што лепшай долі нам прапануюць шукаць за межамі Беларусі. І едуць беларусы, як трыста год таму назад, будаваць палацы ў Расію, каб зарабіць альбо быць ашуканымі. Едуць па доўгі, але такі цяжкі рубель, каб жыць пачалавечы. Каб не з торбаю па свеце хадзіць і глядзець на лялечных дыназаўраў. Бо ніхто ж не прапануе нам на свае вочы пабачыць Луўр, егіпецкія пірамідзі, джунглі Амазонкі, Эрмітаж ці Траццякоўскую галерэю. А калі б і прапанавалі, — у каго грошай на такія вандроўкі хопіць? Свая ноша, кажуць, не цягне. Ды не — цягне, калі за плячыма галеча, праца за капейкі, клопат аб будучыні сваёй і дзяцей, калі наперадзе — безнадзейная стабільнасць, калі не хапае сілы ўзняць галаву і азірнуцца наўкола...

Валерый КАВАЛЕНКА

"ВПЕРЕДИ – ПЯТЬ "МЕРТВЫХ" ЛЕТ..."

Здравствуйте!

Пишу отклик на Вашу статью "Не ту страну назвали Гондурасом". Я пишу, а не звоню, так как в письме проще изложить все свои мысли и ничего не забыть.

Мне просто очень больно, дико обидно за наш народ. Я далека от политики и мало ей интересовалась, но когда приближались выборы, я понимала, что с переменой власти могут начаться реформы. И что-то, пусть не сразу, но улучшится в нашей жизни. Перед самыми выборами я все-таки надеялась, что люди выберут другого президента. Но уже вечером 9 сентября все мои надежды на лучшую жизнь были похоронены. Такой боли, такого пессимизма, такого сильного желания немедленно уехать из этой страны у меня никогда раньше не было. И это чувство обреченности, безысходности, пустоты вынашиваю не я одна. То же чувствуют все мои друзья и знакомые. "Впереди "мертвые" пять лет", — так сказал мой отец.

Только один положительный вывод из выборов я вынесла: оказалось, я и мои родные всетаки очень любим свою страну.

Наша Беларусь медленно вымирает, потому что сегодня рожать детей — очень дорогостоящее дело. Никакими доводами не убедить пожилых людей, что пенсию выплачивает им не президент, а мы — среднее поколение из своих зарплат, отдавая налоги. У моего мужа зарплата 85 тысяч рублей, после всех отчислений остается 75 тысяч руб. У соседа пенсия была 70 тысяч руб., перед выборами стала 80 тысяч руб. Теперь соседа не убедить, что эти 80 тысяч — копейки. Он выбрал Лукашенко, сказав: "он мне пенсию выплачивает, а мне больше ничего не надо". А как мне жить, если на двоих моих детей мне государство выплачивает 36 тысяч руб.? Разделить на двоих — по 18 тысяч рублей. Пожилому человеку — 80, а детям — по 18 тысяч. Если бы не мой отец, то мы бы умерли от голода.

Когда-то я мечтала о четверых детях. Но вот только кто их будет растить?

Ситуация в Беларуси мне напоминает анекдот, когда литовца, украинца и белоруса посадили на кнопки. Литовец раскричался, чуть революцию не устроил, украинец забрал кнопку для хозяйства, а белорус остался сидеть на ней, думая, раз посадили, значит, так и надо.

Раз у нас всем плохо, все нищенствуют, колхозы разваливаются, то, значит, так и надо. Раз так плохо, значит, — это хорошо.

Терпели 7 лет колхоза и еще потерпим.

К статье "Не ту страну назвали Гондурасом" хочется еще дописать такие слова:

Не ту страну
назвали Гондурасом,
И если вдруг мы
встретимся с бедой,
Нам скажут:
"Сам назвался ты Панасом,
Сам говорил,
что кнопку выбирали
"усім калгасам",
Так вот теперь молчи
и рот закрой".

Всего вам доброго.

Елена
(свою фамилию я, по понятным причинам, не называю)

НАВІНЫ

В НОВОМ ПРАВИТЕЛЬСТВЕ – ДВА СЛОНИМЧАНИНА

В состав нового правительства Беларуси вошли два наших земляка.

Это Леонтий Хоружик, который назначен министром природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь, а также Леонид Мальцев – министр обороны нашей республики.

Леонтий Хоружик родился в 1951 году в деревне Жировичи. Работал в колхозе имени Гагарина Зельвенского района, в Жировичском совхозе-техникуме, заместителем управляющего делами президента РБ. Леонид Мальцев родом из деревни Вятеневка Слонимского района. Окончил Военную академию Генерального штаба. Назначался начальником Главного штаба Вооружённых сил Беларуси, первым заместителем министра обороны, а с 1995 года был министром обороны. В марте 1997 года работал заместителем начальника Штаба по координации военного сотрудничества государств – участников СНГ.

Сергей ЧИГРИН

ДА СЛОНІМА "МАТАРОЛЫ" НЕ ДАЙШЛІ

Нядаўна ў рэспубліканскім друку прайшла інфармацыя аб тым, што падраздзяленні беларускай міліцыі атрымалі ў карыстанне 1900 новых радыёстанцый "Матарола" (1500 ручных і 400 аўтамабільных).

Інфармацыя сыходзіла ад рэспубліканскага міліцэйскага начальніка Віктара Мельнікава, і ў ёй гаварылася, што радыёстанцыі былі размеркаваны, у прыватнасці, паміж падраздзяленнямі патрульна-паставой службы.

Карэспандэнт "ГС" звязаўся па тэлефоне з начальнікам Слонімскага ГРАУС Яраславам Халецкім і пацікавіўся, ці атрымалі новыя радыёстанцыі слонімскія міліцыянеры. Як паведаміў Яраслаў Мікалаевіч, ніякіх радыёстанцый яны не атрымлівалі. Трэба думаць, што новыя сродкі сувязі аселі ў сталіцы. Ды і дзе набрацца сучасных рацый на ўсю, больш як стотысячную, беларускую міліцыю?

Мікола КАНАНОВІЧ

БЕЛАРУСІ ДАЮЦЬ КРЭДЫТ

Як паведамілі інфармацыйныя агенцтвы, падпісана пагадненне аб выдзяленні Беларусі пазыкі Сусветнага банка ў памеры 22,6 мільёна даляраў ЗША.

Дакумент быў падпісаны ў Вашынгтоне 26 верасня. Крэдыт даецца на шаснаццаць з паловай гадоў з адтэрміноўкай выплаты асноўнай сумы на чатыры з паловай гады. На момант падпісання дакумента працэнтная стаўка па крэдыту складала 7% гадавых. Атрыманыя грошы павінны быць накіраваны на рэканструкцыю сістэм ацяплення, цеплаізаляцыі і асвятлення прыкладна ў 500 школах, бальніцах і дзіцячых садках нашай краіны.

Трэба адзначыць, што гэта першая пазыка Сусветнага банка Беларусі пасля 1994 года.

Юлія ЦЯРЭНЦЬЕВА

ПЕРЕХОДИМ К ВОДНЫМ ПРОЦЕДУРАМ

Этими словами, если помните, заканчивался комплекс утренней гимнастики на всесоюзном радио. Если бы эта радиозарядка сохранилась до сегодняшнего дня, то жителям новой застройки деревни Чемеры (район "Западный") пришлось бы пропустить весь комплекс упражнений, чтобы своевременно перейти к водным процедурам.



Так выглядит район молодёжной застройки без газа, воды и дорог

А все потому, что, по мнению местной властной вертикали, люди в этом районе водопровод еще лет ...дцать подождать могут.

А колодец берутся выкопать в местном глинистом грунте "всего" за 300 долларов. Но беда-то, собственно, в том, что деньги на водопровод из областного и городского бюджетов, пусть по чуть-чуть (в этом году – 7 миллионов), но выделяют. Только вот средства эти по назначению почему-то не используются. Где они оседают, в какую землю закапываются, с какой водой текут мимо нужного дела – не знает, похоже, никто.

Чтобы добиться вразумительного ответа от властей, людям пришлось обращаться в облисполком. **(Приводим текст)** ⇨

Заместителю председателя облисполкома ЧЕРНОМУ Виктору Валентиновичу от жителей города Слонима, район "Западный" (д.Чемеры)

ЖАЛОБА.

Мы, нижеподписавшиеся жители нового молодежного района "Чемеры", обращаемся к Вам с большой просьбой помочь нам. Мы живем в своих домах по 5 лет без воды, газа и дорог. Мы неоднократно обращались по вопросу решения этих проблем к заместителю председателя горисполкома А.В. Конону, в управление капитального строительства (УКС) к М.И. Лукашевичу, к председателю горисполкома О.Н. Лактюшину, к директору управления "Слониммежрайгаз" А.А. Рудакову, но — безрезультатно.

Все говорят "нет денег" и посылают один к другому. И вот, наконец, послали к Вам.

Одна надежда на Вас, Виктор Валентинович. Узнали мы, что в УКС на этот год выделено 39 900 000 рублей на строительство коммуникаций, но не сделано ничего. И делать не собираются. А наши дети тем временем болеют, в школу не доехать, на работу добраться — проблема.

Убедительно просим Вас разобраться в этом вопросе с нашим городским начальством. Если же и Ваш ответ будет отрицательным, мы будем вынуждены обратиться в администрацию Президента.

С уважением, Л. Анищик, В. Столярчук, В. Дубровский, Т. Чурило, А. Ломейко, Н. Лазарь, Н. Мелешко... (всего 22 подписи).

А поскольку пять лет ждать и жить в предлагаемых скотских условиях людям надоело, то решили они хотя бы газ в свои дома подвести за свои деньги. Для этого пришлось согласовать отклонение от существующего, но мертвого пока проекта газификации района со слонимскими газовиками, платить за разработку проекта этого отклонения 600 тысяч рублей и уже, исходя из этого проекта, складываться по 300 долларов на приобретение труб диаметром 89 миллиметров. Предполагаемое отклонение от первоначального проекта было рассмотрено и одобрено на заседании исполкома. Казалось бы – все, можно начинать проведение газа, пока погода позволяет. Но нет, началась какая-то перепасовка людей от одного чиновника к другому за дополнительными согласованиями, утверждениями, ознакомлениями, которые, конечно же, проходили с прениями и трениями между ответственными лицами и лицами "безответственными".

Но раз уж люди согласились вложить собственные средства в газификацию своих домов, власти настроились заработать себе на этом дивиденты в виде предполагаемого доклада о газификации вообще всего района молодежной застройки Чемеров. А для этого настойчиво рекомендовалось – и даже технически обоснованно – класть трубы уже диаметром в 186 миллиметров. Трехкратный же рост стоимости такого изменения диаметра чиновников мало касается.

Так где же наша народная власть, которая должна (по идее) всячески отстаивать интересы своего народа? Ведь клятвенно заверял и гарантировал в своей предвыборной программе Александр Лукашенко слушать и слышать народ. И здоровье нации должно было, (если ему верить), стать для Президента одним из главных инструментов государственной политики.

А политика эта очень мудра: "всячески поощрять и поддерживать индивидуальное строительство". Видно коммуникации (вода, газ, телефон, канализация) этой политикой не предусматриваются, а здоровье нации достигается путем всеобщего закаливания и приобщения к жизни на природе и в полном с ней единении.

Валерий КОВАЛЕНКО



Депутат Станислав Зданович вникает в суть проблемы

ОПРОС

"КАК МЫ БУДЕМ ЖИТЬ ДАЛЬШЕ?"

На вопрос, заданный "ГС", "Довольны ли вы результатом выборов?" продолжают приходить ответы:

1. Алина Константиновна, 45 лет:

– Да, действительно, обидно за народ. Оппозиция проиграла выборы, потому что она слишком слабая, разрозненная.

2. Юрий Ларюшкин:

– Лично я доволен результатами выборов. Даже очень.

3. Женщина, не назвала своего имени:

– Я проголосовала за Лукашенко, он мне очень нравится. И ничуть не жалею об этом.

4. Сергей, 28 лет:

– Кандидатов, лучше Лукашенко, не было. Поэтому многие и проголосовали за него. Александр Григорьевич был вне конкуренции.

5. Наталья Ефимик:

– Я была в ужасном шоке: неужели столько людей проголосовало за Лукашенко? В следующий раз я на выборы не пойду. У нынешнего президента – одни обещания, больше ничего. Я крайне недовольна результатами выборов. Как мы будем жить дальше? Я не знаю.

6. Ніна Пятроўна, 65 год:

– На 200% пераканана, што падчас выбараў больш было фікцыі, чым праўды. Усе, з кім я размаўляла да выбараў, былі супраць Лукашэнкі. Але зараз, як кажуць, пасля бойкі адносін не высвятляюць.

Подготовила Ольга ШИНКЕВИЧ

НОВОСТИ

ПРЕЗИДЕНТ ПРЕДСТАВИЛ НОВОГО ПРЕМЬЕР-МИНИСТРА

Президент Белоруссии Александр Лукашенко 1 октября представил Совету министров кандидатуру нового главы правительства — Геннадия Новицкого.

Согласно белорусскому законодательству, кандидатуру премьер-министра предлагает на утверждение Палаты представителей президент страны. В Конституции Белоруссии предусмотрен роспуск нижней палаты Национального собрания, если она дважды откажется утвердить предложенную кандидатуру. Между тем Палата представителей II созыва избрана менее года назад, а в течение этого срока Основной закон запрещает ее роспуск.

2 октября открывается осенняя сессия Палаты представителей и вопрос о назначении главы правительства, скорее всего, будет рассматриваться немедленно. После ноябрьского 1996 года референдума по изменению Конституции, в результате которого президент распустил Верховный Совет XIII созыва и из части лояльных ему депутатов сформировал Палату представителей I созыва, взаимоотношения главы государства и парламента были вполне безоблачными.

Геннадий Новицкий родился 2 января 1949 года в Могилеве. По специальности инженер-строитель. В 1994 году был назначен министром архитектуры и строительства. В прошлом году стал заместителем премьер-министра Белоруссии, а 6 октября прошлого года был назначен представителем государства в ОАО "Белорусский банк развития".

ПРИМА

НАВІНЫ

"ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ"

З такой назвай у выставачнай зале мастоўскага музея "Лес і чалавек" адкрылася выстава ручнікоў.

Экспазіцыя прадстаўлена Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі рэлігіі. У яе ўваходзяць тканыя вырабы народных майстрых з паўднёва-усходняй часткі Беларусі.

Выстава пазнавальна-цікавая. Хаця бы ў тым плане, што ў старыя часы ручнік шмат што значыў у жыцці чалавека, меў вялікую сэнсавую нагрузку. Ён суправаджаў чалавека ўсё жыццё: ад нараджэння да смерці. Напрыклад, адразу пасля нараджэння немаўля спавівалі ў ручнік, які меў болей чырвоных колераў, па смерці труну апускалі ў дол на ручніку з больш бляклымі колерамі. І на іншых жыццёвых скрыжаваннях ён меў пэўныя сімвалы. Аб усім гэтым і распавядае выстава.

СТОП МАШЫНА — КАНЕЦ ПАЛІВА

На некалькі дзён спыніўся ўвесь аўтатранспарт ААТ "Мастоўдрэў".

Галоўная прычына – адсутнасць паліва і грошай на яго набыццё. На прадпрыемстве яшчэ не разлічыліся з рабочымі за жнівень.

БУДЗЕ СКАРАЧЭННЕ?

Работнікі мастоўскага райспажыўгандлю занепакоены. У арганізацыі рыхтуецца скарачэнне.

Па папярэдніх звестках, пазбавяцца працы 157 чалавек, і сама сістэма гандлю будзе рэарганізавана.

ЦІ БУДЗЕ ВЫКАНАНЫ РАЁННЫ БЮДЖЭТ?

Пад вялікім пытаннем выкананне мастоўскага раённага бюджэту. Увогуле, на сённяшні дзень ён выкананы толькі на 60%.

У некаторых сельсаветах Мастоўскага раёна – толькі на 50%. Прычына такой з'явы адна – адсутнасць грошай.

УБОРКА ЗАКОНЧЫЛАСЯ, УРАДЖАЙ У ЗАСЕКАХ

Саўгас "Чарлёна" Мастоўскага раёна ў гэтым годзе меў добры ўраджай.

З аднаго гектара намалочана 43,9 цэнтнера зерня, а ўсяго на круг – 3,4 тысячы тон.

Язэп ПАЛУБЯТКА


ПЕРАМОЖЦЫ ЖНІВА-2001

Падведзены вынікі рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы збожжа сярод камбайнераў і вадзіцеляў Гродзеншчыны.

Старшы камбайнёр Аляксандр Мароз і камбайнёр Генадзь Мандрыкевіч з калгаса "Дружба" Слонімскага раёна на "Ніве" намалацілі 546,5 тон збожжа і атрымалі за гэта па тэлевізару. Тэлевізар дастаўся і вадзіцелю з калгаса "Прагрэс" Зэльвенскага раёна Генадзю Скубу. Ён перавёз на аўтамашыне "ГАЗ - 53б" 1545 тон збожжа.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПТУШКАФАБРЫКУ ЎЗНАЧАЛІЎ НОВЫ ДЫРЭКТАР



Дырэктарам Слонімскай птушкафабрыкі прызначаны 38-гадовы Мікалай Данільчык, які да гэтага працаваў галоўным ветэрынарным урачом у калгасе "1 Мая" Слонімскага раёна. Мікалай Мінаевіч пагадзіўся адказаць на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Мікалай Мінаевіч, з чаго Вы пачалі працу на новай пасадзе?

— З аддачы даўгоў, з вырашэння бартэрных пытанняў. Лічу, што неабходна разабрацца з кадрамі на фабрыцы. Бо калі няма спецыялістаў — няма прадпрыемства, а нам сёння не хапае галоўнага эканаміста і галоўнага бухгалтара, а такія спецыялісты не апошнія на любым прадпрыемстве.

— Перад Вамі птушкафабрыку ўзначальваў Мікалай Жыткевіч. Але ён хутка развітаўся з прадпрыемствам. Гэта Вас не насцярожвае?

— Не. Я хачу шчыра падзякаваць Мікалая Уладзіміравіча за тое, што ён у кароткі тэрмін зрабіў для фабрыкі. Найперш, за тое, што ён прыдбаў неабходную тэхніку.

— У апошні час у слонімскіх крамах пачасціліся выпадкі продажу сапсаваных яек. У чым справа?

— Мая версія такая: альбо магазін не паспявае прадаць усе яйкі своечасова, і яны псуюцца, альбо гэта "левыя" яйкі, закупленыя танней не на нашай фабрыцы і не вельмі добрай якасці. Хутка мы на сваім прадпрыемстве ўстановім штампавую машыну і на кожным яйку будзем ставіць дату яго выпуску. І пакупнікі будуць бачыць: свежае яйка паступіла з фабрыкі ці не. Наогул, нашым гандлёвым фірмам трэба працаваць неяк больш актыўней, смялей. Тады будзе поспех і не будуць крыўдзіцца пакупнікі.

— Ці будуць у зімовы перыяд слонімцы забяспечаны яйкамі?

— Сёння адказаць цяжка. На нашай фабрыцы не запоўнены яшчэ два птушнікі. Калі паспеем зрабіць тое, што сёння мы запланавалі, то слонімцаў зімою не пакрыўдзім.

Сяргей ЧЫГРЫН

З ЗАЛЫ СУДА

СЯДЗІБА НА ВЫГАНЕ

Здавалася б, прычым тут каровы да судовай справы? Але якраз гэтыя бяскрыўдныя жывёлы і сталі прычынай канфлікту паміж гаспадарамі сядзібы на Ніжняй вуліцы ў Альбярціне і мясцовымі ўладальнікамі рагуль.

А пачатак гэтай гісторыі хаваецца ў тым часе, калі па рашэнню слонімскага гарвыканкама быў аддадзены пад індывідуальную забудову спрадвечны выган жывёлы.

Свой участак сям'я Салітаў атрымала якраз на выгане каля сажалкі, дзе каровы здаўна п'юць ваду. І пакуль ішло будаўніцтва, ніякіх праблемаў не ўзнікала. Але калі гаспадары справілі наваселле і абжыліся ў новай хаце, то выявілася, што мясцовыя каровы не паважаюць правы прыватнай уласнасці. Гаспадар спраўна абгарадзіў сядзібу, і рагулі на тэрыторыю пляца пранікнуць не могуць, але вакол — робяць, што хочуць. А вядома ж, што можа хацець карова. І ў санэпідэмстанцыю гаспадары сядзібы звярталіся, і да ўладных чыноўнікаў, але каровы як хадзілі там, так і ходзяць, як спраўлялі свае каровіныя патрэбы, так і спраўляюць. Галоўная нязручнасць, можна сказаць, камень сутыкнення паміж сям'ёй Салітаў і ўладальнікамі кароў — сажалка, якая была выкапана, магчыма, яшчэ за царскім часам. А цяпер каровін вадапой знаходзіцца пад самым бокам хаты Салітаў.


З цягам часу з-за гэтага суседства пачалі ўзнікаць канфлікты і сваркі. Каб неяк аддаліць ад хаты каровін статак, Саліта сам абгарадзіў (аплёў лазой) сажалку і зрабіў уваход да яе з супрацьлеглага ад сядзібы боку. Каровіных гаспадароў гэта абурыла, і яны паламалі агароджу.

І вось аднойчы маладая гаспадыня хаты пасварылася з пажылым гаспадаром рагулі. Моцна пасварыліся, нагаварылі адно аднаму абразаў. І прывяла гэтая сварка іх у суд. Калі суддзя, выслухаўшы абодва бакі і зразумеўшы, што тут да чаго, прапанавала маладзіцы і дзеду памірыцца, даравань узаемныя абразы і не даводзіць справу да судовага рашэння, гаспадар каровы заўпарціўся: "Судзіце! Я не вінаваты!" Судзілі. І прысудзілі штрафу ў два мінімальныя заробкі абодвум. Здавалася б, гэта павінна было паслужыць папярэджаннем абодвум бакам. Бо ад такога суседства ўжо нікуды не падзенешся, і патрэбна знаходзіць кампраміс і магчымасці ўжывацца мірна. Але... неўзабаве адбылася новая сутычка: паміж гаспадаром сядзібы на выгане і пажылой уладальніцай каровы. На гэты раз толькі слоўнай перапалкай не абышлося і была ўзбуджана крымінальная справа. Зноў каровы прывялі абодва бакі ў суд. Але ці вінаватыя каровы? І што патрэбна зрабіць, каб пазбегнуць канфліктаў надалей? Відавочна, што хату назад не адбудуеш і нашых людзей не перавыхаваеш, і калі ўжо найшла каса на камень — не прымусіш жыць мірна ніякімі судамі. Значыць, застаецца альбо выган новы арганізаваць, альбо... здаць кароў на мясакамбінат. Бо, відаць, мясцовыя ўлады, калі прымалі рашэнне аддаць спрадвечны выган жывёлы пад забудову, на апошнюю якраз і спадзяваліся. Ды толькі ніяк не хочуць альбярцінскія дзядулі і бабулі (а менавіта яны асноўныя ўладальнікі жывёлы) развітвацца са сваімі карміцелькамі.

Мікола КАНАНОВІЧ

КАРОВЫ ХВАРЭЮЦЬ НА ЛЕЙКОЗ

На мінулым тыдні ў вёсцы Бракава Слонімскага раёна (калгас "Пераможац"), пасля правядзення ветэрынарнай службай аналізу крыві ў кароў, якія належаць вяскоўцам, было выяўлена, што з 23 галоў прыватнага статку толькі пяць рагуль аказаліся здаровымі, а 18 кароў — лейкозныя.



Як патлумачыў галоўны ветурач раёна Мікалай Крупскі, такая колькасць жывёлы захварэла не за адзін год. Справа ў тым, што пасля выяўлення хваробы, гаспадары не спяшаюцца здаваць сваіх рагуль на мясакамбінат, бо існуе праблема, — а чым замяніць хворую карову? У сувязі з гэтым у бліжэйшы час ветслужба раёна і кіраўніцтва калгаса "Пераможац" мяркуюць правесці з вяскоўцамі агульны сход, на якім будзе весціся размова пра магчымыя механізмы вырашэння гэтай праблемы.

Як паведаміў Мікалай Крупскі, па дадзеных на 1 верасня бягучага года колькасць лейкозных кароў у грамадскім статку складала 141 галаву (46 – у калгасе "Пераможац", 58 – імя Леніна і 37 галоў у калгасе "Кастрычнік"). У прыватнай уласнасці на гэты час знаходзілася 30 галоў хворай на лейкоз буйной рагатай жывёлы. Гэта, як зазначыў галоўны ветэрынарны доктар раёна, аднасна невялікія паказчыкі, калі параўноўваць з 1994 годам. У той час толькі ў калгасах і саўгасах налічвалася 5400 галоў хворай на лейкоз жывёлы.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

АРСЕНАЛ НА БРЭСЦКАЙ, 75

Днямі двойчы запар слонімская міліцыя блакіравала жылы дом па вул. Брэсцкай, 75, што ў Слоніме.

Прычынай таму сталі баявыя гранаты, якія належылі маладому малдаваніну. Ён здымаў кватэру ў гэтым доме. Выявілася гэта зброя падчас сваркі, якая ўзнікла паміж кватарантам і гасцямі гаспадароў. У выніку, малады чалавек з Малдавіі выхапіў гранату і пачаў пагражаць гасцям. На шчасце, граната не разарвалася, а людзі своечасова выклікалі міліцыю і затрымалі баевіка.

Аднак на гэтым гісторыя не скончылася. Гаспадыня пачала аглядаць пакой, дзе жыў мужчына, і знайшла ў пакеце яшчэ дзве гранаты. Спалохаўшыся, яна выкінула іх праз фортку на вуліцу. У гэты час ішоў слонімец і выпадкова натрапіў на небяспечныя рэчы. Ён зноў выклікаў міліцыю.

Па гэтаму факту праводзіцца расследаванне.

Наталля ФУРСАВА

АБАКРАЛІ СЕМІНАРЫСТАЎ

Невядомыя зладзеі "пачысцілі" кішэні ў семінарыстаў Мінскай духоўнай семінарыі, што месціцца ў Жыровічах.

Юнакі прыйшлі папарыцца ў слонімскую лазню. Памыўшыся, яны агледзелі, што ў іх кішэнях не аказалася грошай, пашпартаў, студэнцкіх білетаў.

Па гэтаму факту вядзецца праверка.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗАГАВАРЫЛА СУМЛЕННЕ?

Жыхар Ліды, грамадзян М., прыйшоў у дзятлаўскую міліцыю з павіннай.

Ён прызнаўся, што летам украў у сваёй бабулі, якая жыве ў вёсцы Малыя Краглі Дзятлаўскага раёна 210 тысяч беларускіх рублёў.

ЗАТРЫМАНЫ З ГАЛОЎКАМІ МАКУ

У вёсцы Пацаўшчына Дзятлаўскага раёна міліцыя затрымала двух жыхароў Слоніма.

Яны мелі пры сабе два поліэтыленавыя пакеты з макавай саломкай.

РАЗАБРАЛІ СЦЯНУ

Жыхар Дзятлава, грамадзянін В., паскардзіўся ў міліцыю, што ноччу невядомыя асобы разабралі ў яго гаражы сцяну.

Міліцыя шукае вінаватых.

УКРАЛІ ЯДАХІМІКАТЫ

У калгасе "Новае жыццё" Дзятлаўскага раёна са склада зніклі ядахімікаты.

Супрацоўнікі мясцовага аддзела ўнутраных спраў займаюцца пошукам невядомых асоб, якія учынілі крадзёж калгаснай маёмасці.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

БІЗНЕС НА МОГІЛКАХ

У Мастах міліцыя затрымала мужчыну.

Ён падазраецца ў тым, што доўгі час краў на могілках пахавальную атрыбутыку ды прадаваў яе.

Антон МАКЕЙ

АПЫТАННЕ

ЯКІ НАСТРОЙ У НАСТАЎНІКАЎ?

Штогод, у першую нядзелю кастрычніка, у Беларусі адзначаецца свята — Дзень настаўніка.


Слонімскія школьнікі

Фота Віталя ГІЛЯ

Вядома, нялёгка сёння працаваць у школе, асабліва ў вясковай. З гэтай нагоды карэспандэнт "ГС" запытаўся ў кіраўнікоў сярэдніх школ Слонімскага раёна, з якім настроем яны і іх калегі, вясковыя настаўнікі, сустракаюць гэта свята.

Лідзія Шэмет, дырэктар Глоўсевіцкай сярэдняй школы:

— Настрой у глоўсевіцкіх настаўнікаў баявы, хаця працы ў пачатку новага навучальнага года хапае. Цяпер з вучнямі працуем у полі, дапамагаем саўгасу ўбіраць бульбу. Школа наша невялікая — усяго 47 вучняў. Сам будынак школы сёлета пафарбавалі сваімі сіламі, трохі раённы аддзел адукацыі дапамог. Побач з вопытнымі настаўнікамі Марыяй Аляксееўнай Дэйка і Вольгай Міхайлаўнай Гарох працуюць маладыя педагогі. Я, як дырэктар, імі задаволена.

Ганна Рудая, дырэктар Касцянёўскай сярэдняй школы:

— Сваё прафесійнае свята мы сустракаем эксперыментальнай працай. Вучні нашай школы паглыблена вывучаюць рускую мову, матэматыку і інфарматыку на камп'ютэрах. Што датычыць сёлетніх выпускнікоў, дык яны нас, настаўнікаў і бацькоў, не вельмі парадавалі. Проста гэта быў слабы клас, таму многія з іх не паступілі туды, куды хацелі. Не заўсёды ўсё, чаго хочацца, удаецца. Тым не менш, мы не адчайваемся.

Людміла Грабун, дырэктар Сялявіцкай сярэдняй школы:

— Калектыў у нас творчы і цікавы, таму Дзень настаўніка сустрэнем у добрым настроі. Сёлета ўпершыню наша школа перайшла на дзесяцібальную сістэму адзнак. Напрыклад, тройка — гэта 1, 2, 3 і 4 балы, пяцёрка з плюсам — гэта дзесяць балаў. Дзецям такая сістэма падабаецца.

Зоя Зімніцкая, дырэктар Шылавіцкай сярэдняй школы:

— З чым тут добрым сустрэнеш свята? Працаваць настаўнікам сёння вельмі цяжка. Вось, каб вы не нагадалі, дык я і не ўспомніла б пра Дзень настаўніка. Радуе тое, што школу да навучальнага года як змаглі, так і падрыхтавалі з бацькамі. Адрамантавалі трубы, закупілі новы посуд для школьнай сталоўкі, укамплектавалі класы... Да нас у калектыў прыйшлі трое маладых настаўнікаў. Ужо цяпер у іх праяўляецца ініцыятыва. Вось так паціху і будзем рухацца да свята.

Тамара Антончык, намеснік дырэктара Навасёлкаўскай сярэдняй школы:

— Усе здаровыя, дзякаваць Богу, ходзім на працу, вучым дзетак. Сёлета ў нас было толькі 6 выпускнікоў. Усе яны паступілі ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. З іх трое сталі навучэнкамі Слонімскага медвучылішча.

Ірына Філіпчук, дырэктар Жыровіцкай сярэдняй школы:

— Свята сустрэнем з добрым настроем, з добрымі паказчыкамі ў працы і ў вучобе. Мы задаволены тым, што сёлета выпускнікі Жыровіцкай школы паступілі туды, куды хацелі. Апраўдалі медалі і выдатнікі. Сваім калегам па працы і ўсім настаўнікам Слонімшчыны напярэдадні нашага свята хочацца пажадаць прафесійнай творчасці, добрага здароўя, бо калі яно ёсць, тады выдатна працуецца. Каб у іх сем'ях былі шчасце і дабрабыт.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПРАБЛЕМА

НА СОЗИДАТЕЛЬНЫЕ ДЕЙСТВИЯ НЕ СПОСОБНЫ

Начальнику ЖЭС-3 г. Слонима

КОПИЯ: председателю городского исполнительного Комитета г. Слонима


В третий раз обращаюсь к Вам с просьбой устранить безобразия, появившиеся в результате бесхозяйственности и халатности работников коммунальных служб в районе дома №110 по ул. Косовский тракт. Первые два раза главный инженер ЖЭС-3 (в июне сего года) и Вы, Олег Николаевич (в июле), по телефону заверили о личном вмешательстве в решение этих вопросов. На сегодняшний же день все остается на своих местах. Более того, в силу природных явлений и полнейшего свинства и хамства отдельных отпрысков этой природы, проблемы разрастаются.

Напоминаю, о чем идет речь.

1. Рядом с трансформаторной будкой, которая находится напротив нашего дома, имеется бетонный колодец, который когда-то был накрыт железобетонной плитой. Еще прошлой зимой плиту проломала грузовая машина. Плита упала на дно колодца и теперь находится в положении, максимально удобном для того, чтобы дети, постоянно играющие рядом, могли насквозь проколоть себя или изрядно покалечиться, упав на торчащие прутья арматуры. И, удивительно, как этого еще не произошло до сих пор?

К тому же, колодец стал не опорожняющимся мусоросборником, в котором мусор просто перегниает. Но это, по-видимому, удобно и дешево для коммунальных служб.

Уважаемый начальник ЖЭС-3. После нашего с Вами разговора, самым исполнительным во вверенной Вам службе оказался дворник, кстати, всегда добросовестно работающий на нашем участке. Он очистил колодец от мусора. Приезжали, правда, раза два еще какие-то горе-работники на спецмашине. Но почему-то далее, чем выкурить по сигарете, сидя у края злополучного колодца, дело у них не пошло. Видимо, в отличие от наших детей, спускаться вниз они побоялись.


"Медвежья" западня на Энке

Фота Віталя ГІЛЯ

2. Весной этого года бравые ребята сливали для каких-то профилактических целей воду из другого колодца, теперь уже из канализационного. Тонны ржавой воды веселыми ручьями сбегали с горки, размывая склон и без того чахлый травяной покров, доставшийся нам, жильцам "Энки", от турецких строителей. Овраг, или по-американски — каньон, получился средней величины. Но буквально несколько дождей переплюнули ребят из водоканала: тонны, теперь уже песка, "уплыли" вниз. Но если благоустройство прилегающей к дому территории волнует, по большому счету, только живущих в этом доме людей, то, может быть, кого-нибудь заинтересует тот факт, что в размытом овраге показалось нечто похожее на фундамент сооружения, именуемого в народе "трансформаторной будкой". И думается мне, что до контура заземления молниезащитного устройства осталось немного, а так гляди, и силовые кабели покажутся.

3. К двум злосчастным точкам, описанным выше, для полноты картины добавляется находящееся рядом на высококачественном турецком бетонном покрытии масляное пятно, протяженностью метров 20 (двадцать). Кстати, происхождение его известно: один маленький автомобильчик "Нисан", назойливо паркующийся напротив трансформаторной будки, вот уже три года оставляет после своей стоянки неизменную черную лужицу отработанного масла. Просьбы окружающих устранить неполадки, чтобы масло не липло к подошвам, не нашли отклика в сердце хозяина сего авто.

Кто поможет в данном случае людям в борьбе с хамством? В цивилизованном обществе эти функции без напоминаний берут на себя различные государственные структуры, но никак не налого- и коммунальноплательщики. Представители государства, кто-нибудь, отзовитесь! Ну, не только же в "съеме" коммунальных платежей и налогов Ваш удел.

Это что касается освежения памяти. Сейчас же — суть обращения к Вам. Все просто. Несмотря на тот факт, что жильцы вверенных Вам кварталов города вносят плату за оказываемые ЖЭСом услуги и по сути дают Вам и Вашим помощникам возможность существовать, перефразированный принцип "Не жильцы для ЖЭСа, а ЖЭС для жильцов" остается в силе. Обращаю на это внимание и выражаю уверенность, что Вы и Ваш главный инженер вновь посетите вышеназванные места и примете, наконец, волевое решение. Возможно, Вам удастся подметить еще и лоскуты отслоившейся краски на фасадах таких красивых недавно домов.

ЗАКЛЮЧЕНИЕ.

Многие из нас привыкли к унижениям со стороны так называемых чиновников, что даже перестают считать это за унижения. Так вот, я считаю, что Ваша необязательность и наплевательское отношение к просьбам и обращениям трудящихся (выполнение которых является Вашей служебной обязанностью) — это худшее унижение. Так дело не пойдет. Надеюсь на немедленные созидательные действия.

Как человек занятой, очень ценю время свое и чужое, и поэтому заранее благодарен, что Вы уделили внимание и нашли время для чтения этого обращения, явившегося на свет совсем не от скуки. Жду, что Вы в кратчайший срок пришлете отчет по волнующим меня и еще многих людей вопросам и тем самым не распишетесь в собственном бессилии, как одна из городских служб.

7 сентября 2001 года. С оптимизмом, Василий РАПЬЕВЕЦ

От редакции:

Возможно, затронутые в этом обращении проблемы кому-то покажутся малозначительными для такого развернутого анализа и всестороннего обсуждения. Но такова уж наша жизнь. В каждый открытый люк, в каждую колдобину, не говоря уже о более серьезных вещах, самых разных должностных лиц приходится "тыкать носом". Чем же еще можно "достать" непробиваемого начальника, чиновника, просто безалаберного работника, как не такими вот многократными заявлениями, не дающими сидеть им на своем теплом месте. Только так можно заставить их делать свое конкретное дело, а не рассуждать о высоких материях и материальных трудностях.

Пусть о высокой, большой политике рассуждают и думают большие политики, а материальные, финансовые трудности и вовсе придуманы исключительно для нашего все понимающего и прощающего народа. Мы ведь исправно платим налоги, в стране стабильный экономический рост, доходы населения неустанно ползут вверх. Так что никто не докажет мне, что у государства не хватает денег, чтобы залатать прореху в дорожном полотне, вкрутить перегоревшую лампу в единственный у дома фонарь или вовремя закрыть канализационный колодец люком.

Так что, пишите, пишите и пишите. Станьте поперек горла тем, кто не обращает внимания на ваши устные жалобы. Пусть они возненавидят вас, но сделают вовремя, в срок и с должным качеством то, что делать должны и без напоминания.

Раз уж официальная бумага для чиновника — нечто божественное, то пусть же, наконец, божеством для них станет народ. А резолюция вышестоящего начальника на вашем послании подстегнет их к действию.

Валерий КОВАЛЕНКО

Газета Слонімская
4 — 10 кастрычніка 2001г. №40 (226)

ПРАВИТЕЛЬСТВО БУДЕТ ЕЩЕ МЕНЕЕ "ПРОФЕССИОНАЛЬНЫМ"

Один из лидеров белорусской оппозиции, бывший премьер-министр Михаил Чигирь считает, что формируемое правительство будет еще менее профессиональным, чем предыдущее.

"Произошедшие перестановки, я считаю, не на пользу профессиональному уровню правительства, — заявил он в беседе с корреспондентом БелаПАН. — А если будет заменен премьер-министр Владимир Ермошин, то это станет еще одной ошибкой". При этом экс-премьер считает, что, скорее всего, Ермошин будет отправлен в отставку, так как во время предвыборной кампании не проявил достаточной лояльности к Лукашенко. По мнению Чигиря, Ермошин руководил правительством в этот период так, "будто никакой избирательной кампании в стране не проводится".

Говоря о наиболее неудачных назначениях в новом правительстве, бывший премьер особо обратил внимание на назначение Александра Шпилевского председателем Государственного таможенного комитета. По словам Чигиря, этот человек не является профессионалом в таможенном деле. "Это сфера, в которой не разберешься за неделю или месяц, — отметил он. — Это потяжелее, чем иностранный язык выучить. Поедет он вести переговоры, например, с руководителем таможенного комитета России. Понятно, что равноправных и грамотных переговоров у них не получится".

Бывший премьер-министр считает, что сегодня необходимо решительно сократить контролирующие органы и изменить их функции. Из-за необоснованных предвзятых проверок многие субъекты хозяйствования не могут нормально работать, разоряются, остаются фактически без денег, отметил он.

Что касается возможной эффективности деятельности нового правительства, то, по мнению Михаила Чигиря, вряд ли оно сможет справиться с экономическими проблемами страны. "Я считаю, что улучшить жизнь народа новое правительство не сможет", — сказал он. По мнению бывшего премьера, экономика будет находиться в застое, возможностей для роста ВВП, который осуществлялся за счет инфляции, также остается все меньше. Инвестиций в экономику как не было, так и не будет, поскольку выборы не признаны международным сообществом. Будет продолжаться постепенное снижение курса национальной валюты. На успехи рассчитывать не приходится, но и резкого обвала не будет, "так как падать уже особенно некуда", — сказал М.Чигирь. Если и произойдет что-то существенное в экономике, так это, по его словам, "продажа ключевых белорусских предприятий машиностроения и нефтехимии крупному российскому капиталу, что было обещано Лукашенко взамен поддержки на выборах". Это, как отметил экс-премьер, приведет к сокращению рабочих мест, ликвидации социальной сферы и так далее.

Одним из немногих положительных моментов при формировании правительства Михаил Чигирь назвал сокращение аппарата. "То, что происходит сокращение количества чиновников в стране — это хорошо, — сказал он. — Но я думаю, что можно было сократить и больше, чем на 10-15 процентов, о которых сказал Лукашенко".

Геннадий БАРБАРИЧ

СТАРЕЕМ



За разговором на крылечке

В последние годы в Беларуси идет активный процесс старения населения, сообщил начальник управления медэкспертизы, реабилитации и санаторно-курортного лечения Министерства здравоохранения Владимир Пилипенко на пресс-конференции 25 сентября.

Его встреча с журналистами была приурочена ко Дню пожилых людей, который отмечался 1 октября. По словам Пилипенко, сейчас в Беларуси проживает более 2 миллионов человек в возрасте 60-ти лет и старше. Увеличивается число одиноких и больных людей, страдающих хроническими заболеваниями, со сниженной двигательной активностью и способностью к самообслуживанию. За последние пять лет заболеваемость пожилых людей в республике увеличилась на 6—10 процентов. Это вызвано ростом количества заболеваний системы кровообращения и нервной системы, а также новообразований, эндокринных и психических расстройств.

Потребность в госпитализации больных пожилого и старческого возраста превышает в три раза аналогичный показатель для людей среднего возраста. А из общего числа госпитализируемых в отделения терапевтического профиля лечебно-профилактических учреждений Минздрава пожилые пациенты составляют около 40 процентов. Изменить ситуацию к лучшему призвана гериатрическая служба (гериатрия — раздел клинической медицины, которая изучает особенности заболеваний у людей пожилого и старческого возраста, разрабатывает методы их лечения и профилактики. — БелаПАН.). По словам Пилипенко, белорусская гериатрическая служба успешно развивается. Ее деятельность координируют Министерство здравоохранения и кафедра гериатрии и геронтологии Белорусской медицинской академии последипломного образования.

Ольга ОСИПЕНКО

МИНИСТР ХОТЕЛ БЫ ВИДЕТЬ ВЕЖЛИВЫХ МИЛИЦИОНЕРОВ



Слонимские милиционеры работают на ул. Я. Купалы

Выступая на встрече с трудовым коллективом республиканского унитарного предприятия "Азот", министр внутренних дел заявил о разработке принципиально новой программы отбора и приема на службу в милицию, а также обучения молодых милиционеров.

По словам Наумова, белорусское общество все чаще сталкивается с фактами "волокиты, предвзятости, бюрократии, равнодушия" в органах правопорядка. "Я бы очень хотел, чтобы все сотрудники милиции были вежливыми, серьезными людьми", — так объяснил министр основную идею разрабатываемой программы.

При этом он отметил, что хотя "в милицию идет мало людей по зову сердца, подавляющее большинство сотрудников работает эффективно". В качестве примера министр привел Гродненскую область, где раскрываемость убийств составляет 93 процента. Согласно проведенному тестированию жителей области, 60 процентов населения положительно относится к людям в форме.

В тот же день Владимир Наумов провел в Гродненском облисполкоме прием по личным вопросам, а также совещание с руководством управления внутренних дел Гродненской области.

Павел МОЖЕЙКО

ЗОЛОТО – ЕСТЬ ЗОЛОТО

За первый месяц реализации Национальным банком золотых мерных слитков население выкупило их около 400 общим весом почти 9 килограммов.

Об этом БелаПАН сообщил пресс-секретарь Нацбанка Михаил Журавович.

По его словам, особой популярностью пользовались слитки в 1,5 грамма и 10 граммов, а самый крупный купленный слиток был весом в 250 граммов. Как отметил М.Журавович, из первой партии, предложенной для реализации, все мелкие слитки были раскуплены в течение месяца. Спрос на них будет учтен при изготовлении последующих партий. Невостребованными пока остаются золотые мерные слитки в 500 и 1000 граммов.

Золотые мерные слитки самого высокого качества (проба 999,9) пока реализует главное управление Национального банка по Минску и Минской области, расположенное в столице Беларуси по ул. Кальварийской, 7. Но, как сообщили в Нацбанке, к концу года их можно будет приобрести и в других главных управлениях в областных центрах, а в перспективе — и в отделениях главного банка страны в райцентрах. Кроме того, в ближайшем будущем куплей-продажей слитков будут заниматься и коммерческие банки при наличии соответствующей лицензии.

Алексей ОРЕШКО

ФИЗИК ХОЧЕТ ПОМЕНЯТЬ ПСИХОЛОГИЮ

Минчанин Валерий Потапов, по образованию физик (окончил БГУ в 1964 году), утверждает, что им создана теория и технология, которые позволят изменить психологию человечества.

Речь в его концепции идет, во-первых, о необходимости построения теоретического фундамента, ставящего интеллект в основу жизни; во-вторых, о создании механизмов, дающих возможность человечеству развивать интеллект взамен стереотипов; в-третьих, о переориентации ответственности с государства (общества) на гражданина (личность).

Работа Валерия Потапова явилась своеобразным ответом на заключение первого президента Римского клуба Аурелио Печчеи, которое он сделал в своей книге "Человеческие качества": "Сформулировав общую теорию материи, человечество так и не удосужилось заняться созданием общей теории жизни".

В этой книге и других публикациях клуба проводится анализ состояния планеты и утверждается, что если человечество не сможет изменить свои качества, т.е. психологию, то оно, безусловно, погибнет в наступившем веке.

Римский клуб — неправительственная организация, образованная в 1968 году и объединяющая 100 видных ученых, общественных деятелей, экономистов, бизнесменов, действующих и бывших глав государств всех континентов. Они убеждены, что будущее человечества не предопределено раз и навсегда, и что каждый человек может что-то сделать для улучшения жизни на Земле.

Николай ГРЕЧУХА

ПОЖАР НАЧАЛСЯ В ГАРДЕРОБЕ

На предприятии "Гродномебель" в Гродно произошел пожар.

Как сообщили БелаПАН в пресс-службе Министерства по чрезвычайным ситуациям, огонь охватил два раздельных гардеробных помещения административного корпуса общей площадью в 25 квадратных метров. Дополнительно были обнаружены еще три очага пожара: прицеп с отходами пиломатериалов, стоявший под загрузочной рампой, склад шпонозаготовочного цеха и аккумуляторная. Огнем повреждены шкафы и отделка стен в гардеробах, а также загрузочная рампа. Предполагаемая причина пожара — поджог.

За прошедшее время в стране произошло 35 пожаров, в которых погибло 4 человека (из-за неосторожности при курении) и нанесен материальный ущерб в сумме 12,6 миллиона рублей. Пожарные спасли одного человека и материальные ценности на сумму 21,9 миллиона рублей.

Марат ГОРЕВОЙ

ЗАРПЛАТА В ЦИФРАХ

Заработная плата колхозников и работников социального обеспечения продолжает оставаться меньше минимального потребительского бюджета (МПБ).

По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, в июле зарплата колхозников составила 80,7 тыс. рублей (94,4 процента МПБ), работников социального обеспечения — 80 тыс. (93,6 процента). Ненамного лучше материальное положение работников совхозов — 98,5 тыс. рублей (115,3 % МПБ), культуры — 97,9 (114,5), образования — 110,8 (129,6), искусства — 111 (129,8). При этом речь идет о начисленной, а не выплаченной заработной плате.

Самые высокие в стране заработки — у работников нефтеперерабатывающей (342,5 тыс. рублей, или 400,8 % МПБ), нефтедобывающей (380,7 тыс., или 445,5 %) и горнохимической (424,3 тыс., или 496,5 %) промышленности.

Дмитрий ВЛАСОВ

фельетон



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Вясковая казка

Было ў бацькі тры сына. І прыйшла ім пара жаніцца. Выйшлі яны ў чыстае поле і пусцілі з лукаў стрэлы ў розныя бакі: маўляў, куды страла трапіць, там і жонку шукай. Старэйшы сын пацэліў акурат у акно "Мерседэса", дзе сядзела дачка новага беларуса. Стралу сярэдняга злавіла супрацоўніца камерцыйнага банка. Таксама няблага. А малодшы сын шукаў-шукаў сваю стралу — з ног збіўся, а знайсці нідзе не можа.

— Ты ў балоце глядзі, можа дзе Царэўна-жаба падхапіла, — параіў бацька.

— Добра табе казаць. Цяпер балоты павысушвалі, за сто вёрст наўкола не знойдзеш, — засумаваў сын.

— Шукай, Іван, — каротка прамовіў стары, — там твая доля.

Назаўтра набраў Іван харчоў, віна пару бутэлек у кішэні запхнуў і пайшоў у белы свет як у капейку.

Тыдзень яго не было, другі, а на трэці прыносіць дадому жабу ў насоўцы.

— А што я табе казаў. Усё роўна як у казцы! — узрадаваўся бацька. — Ноччу скуру спаліш — і будзе табе жонка.

— Дык яна ж птушкай абернецца і паляціць. Шукай тады ветру ў полі.

— Куды яна з калгасу паляціць, дурань. Заўтра пойдзе з бабамі буракі палоць, бо дзялкі ўжо за выганам падавалі.

Так яно і здарылася. Спаліў ноччу Іван жабіную скуру, а Васіліса і ўзрадавалася, кажа раніцай:

— Дзякуй табе, Іванка, а то надакучыла мне жабаю быць, у казачным царстве жыць. Хачу, як ты, па-вясковаму.

— Добра, — кажа Іван. — Зараз прынясу з павеці дзябку і пойдзеш з вясковымі бабамі буракі палоць. Бурачкі там, праўда, толькі з зямлі праклюнуліся, затое пырнік па костачкі. Работа простая, як стары лапаць: дзябай сабе і дзябай. Бурачкі пакідай, а пырнік дзябай.

— А плаціць будуць? — пацікавілася Васіліса.

— Паспееш з аплатай. Ты яшчэ за работу не ўзялася. Праз месяцы тры-чатыры крыху заплоцяць. Ідзі, бо вясковыя бабы ўжо на полі, абгаворваюць будуць, што доўга спіш.

Пайшла Васіліса. Знайшла сваю дзялку і ўзялася за работу. Бурачкі і сапраўды маленькія, як пазногаць немаўляткі, затое пырнік ужо касіць можна. Лупіш- лупіш дзябкай, а яму хоць бы што. Карэнні, не раўнуючы, як чэрві ўсю глебу пераплялі. Васіліса хоць і ў казцы раней жыла, але паняцце аб траве мела. "Дык ён жа зноў будзе расці, — з роспачу падумала. — Гэта ж не лебяда якая ці свірэпка. Цэлае лета тут мне кукаваць прыйдзецца." Сказала аб гэтым жанчыне, што корпалася на суседняй дзялцы.

— А як ты думала, галубка, — прамовіла тая. — Ты хоць маладая, а мы ж, паглядзі, старыя ўсе, даўно на пенсіі, але дзяўбём, як міленькія. Ох, лягу я, крышку адпачну, а то і спіна баліць, і ногі гудзяць, — завохкала старая і плюхнулася проста на пырнік з пяском.

Пакуль сонца дакацілася да палавіны неба, Васіліса ўжо не чула ні рук, ні ног. Паплялася яна на абед ды і расказала свёкру пра ўсё, што бачыла на полі, бо Івана дома не было: на трактары калгасную бульбу пасляпому акучваў.

— Не пераломішся, — коратка адказаў ёй на ўсе скаргі свёкар. — Тая старая, што на пырнік прылегла, гультайка несусветная. Семдзесят гадоў увесну мінула, а яна ўжо нямоглую з сябе корчыць. Усё жыццё буракі палола, а цяпер ёй цяжка. Ну, пырнік, дык і што ж, каравул крычаць. Трэба, значыць, выполвайце і пырнік, паненкі. І ты, Васіліса, запомні адразу: тут табе не казка, цудаў не бывае. Дзялка твая — табе і палоць. Па шчупаковаму загаду ў нас нічога не робіцца. А цяпер, даражэнькая, бяры вядро ды ідзі даіць карову, бо неўзабаве зноў на пашу пагоняць. А потым свінням дасі, бо ўжо платы ломіць прорва гэта. Ды курам не забудзься ячменю сыпнуць, гусям травы падкінуць ды вады наліць. Вось і адпачне твая спіна. А потым, як карову на пашу выганіш, за дзябку ды зноў на бурачкі. А я касіць пайду.

Вечарам Васіліса з поля ледзь прыплялася. Ідзе па вуліцы, а насустрач ёй кароў з пашы гоняць. Узяла дайніцу ды ў хлеў. Потым курэй накарміла, ды свіней, ды гусей.

— Нявестка, ты там хутчэй на дзялцы варушыся, — строга папярэдзіў свёкар, — а то будзеш калупацца ў тым пырніку да Пятра, а свой агарод ужо зарастае. Бачыла, як бульбачка за калодзежам добра паўзыходзіла, а па ёй — лебяда. Ды і моркву, цыбулю трэба палоць. Так што сумаваць табе тут не будзе калі.

Хоць і стамілася Васіліса, хоць і з ног валілася, але ў пасцель жа, не памыўшыся, не ляжаш.

— Іван, а дзе ж у вас тут ванна ці душ які? — спытала, калі вочы ўжо амаль заплюшчваліся ад стомы.

— Ну, ты і адмачыла! — зарагатаў Іван. — Ванна, душ! Ідзі вунь на надворак да калодзежа, спаласні крыху пясок ды і ўсё. Якое табе ў вёсцы мыццё? Пра ванну пытае. А сауну, часам, не хочаш?

— Дык вада ж халодная, — забедавала Васіліса.

— Нібыта ты ў цяплейшай боўталася, як жабай была. Каму-каму, а табе вады баяцца брыдка.

— Ну, то хоць каб у суботу як след памыцца. Можа ў вашай вёсцы лазня ёсць? — зноў пра сваё вядзе Васіліса.

— Лазня ёсць, але ў ёй ужо даўно ніхто не мыецца.

— Што ты, сын, маніш? — абазваўся з печы свёкар. — На Вялікдзень жа мыліся. Я нават сам хадзіў. Ды і ты ж хадзіў, хіба забыўся ўжо?

— Забыўся, — шчыра прызнаўся Іван. — Так што, дарагая, чакай Вялікадня, тады і лазня табе будзе, — супакоіў ён жонку. А цяпер і калодзежам абыдземся, не паны, нябось.

Спаласнулася Васіліса халоднай вадой і амаль сонная падкацілася Івану пад бок.

— І што, гэта кожны дзень так будзе? — спытала з кволай надзеяй на нейкія змены.

— Гм, дзень! І месяц, і год. Ды ў нашым калгасе заўсёды так будзе, балотная твая галава.

— Тады навошта ты спаліў маю жабіну скуру? Хто цябе прасіў?

— Прывыкнеш! — упэўнена сказаў Іван і захроп так, нібы па бляшанай страсе замалаціў град.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВЫРОСЛИ ТАРИФЫ НА УСЛУГИ ЭЛЕКТРОСВЯЗИ

После полугодового перерыва в Беларуси выросли тарифы на услуги электросвязи. Повышение составило от 0,9 до 10,6 процента.

В частности, стоимость минуты разговора по квартирному телефону с абонентом из того же населенного пункта увеличилась с 2,57 до 2,80 рубля, внутри области – с 7,5 до 8,25, между областями – с 15 до 16,5. Тарифы для предприятий и организаций повысились соответственно с 3,89 до 4,24, с 8,5 до 9,4 и с 17 до 18,8 рубля. Кроме того, по информации, полученной БелаПАН в РО "Белтелеком", с 1 октября для субъектов хозяйствования отменяется ежемесячное предоставление 60 минут бесплатных телефонных разговоров по местной связи – с целью снижения убыточности услуг, предоставляемых на местных сетях.

Абонентская плата за пользование телефоном, переведенным на повременную оплату, выросла с 524 до 570 (для населения) и с 830 до 903 рублей (для предприятий и организаций), за пользование телефоном, не переведенным на повременную оплату, – с 842 до 916 (для населения) и с 1.588 до 1.728 рублей (для предприятий и организаций).

